Whiteruthenian News Paper "The Fatherland" Authorized by EUCOM Hq. Civil Affairs Division 27. July 1949, Nr. UNDP 225. Circulation 3500 copies. Administration: (13b) Rosenheim, Pionier-Kaserne, Whiteruthenian, DP Camp. Responsible Publisher: Wladimir Bortnik. Printed by Ph. L. Jung, München 7, Eduard-Schmid-Str. 24.

БАЦЬКАЎШЧЫНА

WHITERUTHENIAN NEWS PAPER "THE FATHERLAND"

Цана 30 н. фэн., для заграніцы — 50 н. ф.

№ 1 (61) 1 Студзеня, 1950 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 4.

РАДАСЬЦІ й ШЧАСЬЦЯ ЎСІМ СУРОДЗІЧАМ

Вялікія дні БАПЦ



Хіратонія Архімандрыта а. Васіля ў Епіскапы БАПЦ.

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква, а зь Ею й ўся нашая беларуская эміграцыя залатымі літарамі ўпіша ў сваю гісторыю даты 18 і 19 сьнежня 1949 г.

У гэтыя вялікія дні Госпад Бог спадобіў нашую Царкву і ўсіх нас свае вялікае Прасьвяды — Хіратоніі нашага Архімандрыта а. Васіля ў Епіскапы БАПЦ.

Сама хіратонія была папярэджаная пастановай сьвятарнага Сабору Епіскапаў Украінскае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы, на чале зь Мітрапалітам яе Высоканайсьвятарнейшым Уладыкаю Палікарпам што да правядзеньня яе. Усе сьведамае беларускае грамадзтва ня толькі ў Розэнгайме ці Нямеччыне, але і ўва ўсіх вольных краех сьвету зь нецярплівасьцяй і радасьцяй чакала на гэтыя шчасьлівыя для іх дні.

І вось, ужо 15 сьнежня зьявіўся ў Розэнгайм дасюлешні апякун БАПЦ Яго Найсьвятарства Епіскап Сергі, прывітаны духоўнымі ўладамі і ўсімі вернікамі БАПЦ як свой родны духоўны бацька. Ужо ў сыботу 17 сьнежня духоўныя й грамадзкія беларускія ўстановы мелі радасьць прывітаць з хлебам і соляй у Розэнгайме Высокадастойнага гасьця — Найсьвятарнейшага Епіскапа Платона, Сакратара Сьвят. Сыноду УАПЦ у супровадзе Пратадыякана й Гіподыякана. Разам зь ім прыбылі два Пратаіерэі БАПЦ з францускае зоны — айцы Хведар Данілюк і Сьцяпан Войтэнка. Адначасна пачалі прыбываць госьці з розных зонаў Нямеччыны, сярод іх сьвятары й дыяканы.

У нядзелю — 18 сьнежня прыбыў да нас новы Высокадастойны госьць — Найсьвятарнейшы Епіскап Вячаслаў у суправодзе двох сьвятароў, дыякана й двох Гіпадыяканаў.

Тымчасам вялікім радасным рэхам адбілася ўва ўсіх нашых сэрцах прывітальная тэлеграма Яго Высоканайсьвятарства Уладыкі Мітрапаліта Палікарпа, як сымбаль саюзу й любасьці дзьвех сестраў — УАПЦ і БАПЦ.

І вось 18 сьнежня на ўсяночнай пачаўся ўрачысты Акт Хіратоніі ў Епіскапы нашага айца Архімандрыта Васіля. Нашая вялікая, прыгожая Катэдральная Царква сьв. Мікалая была запоўненая вернікамі.

На катэдры сярод Царквы занялі месца ўжо ўспомненыя тры Епіскапы. Перад імі — 2 Пратаіерэі й 5 сьвятароў, Пратадыякан, чатыры Дыяканы, за імі чатыры Гіподыяканы. У вадпаведны мамэнт два беларускія Пратаіерэі прыводзяць нашага кандыдата ў Епіскапы — Архімандрыта а. Васіля і ставяць яго перад Уладыкамі. Пасьля колькіх пытаньняў да яго з боку кіраўніка Хіратоніяй Епіскапа Платона, а. Васіль складае свае асьветчаньне. У часе ягонага глыбокага чуцьцевага і ўзварушлівага асьветчаньня бальшыня вернікаў плача, плача ад радасьці й хваляваньня.

На другі дзень, у нядзелю 19 сьнежня, прыехалі ў Розэнгайм новыя госьці — дэлегацыі ад розных арганізацыяў, як сваіх, так і братніх народаў — Украінцаў, казакаў, харватаў, грузінаў і інш. Наплываюць прывітаньні розных арганізацыяў зь Нямеччыны й із іншых краінаў, між імі ад ІНКОПОРЭ, ад АБН і інш.

Пачынаецца Сьв. Літургія. Духавенства, на чале зь Епіскапамі, вакол Сьвятога Пасаду. Вочы ўсіх вернікаў усьцяж зьверненыя на іх і нашага Кандыдата. Чакаюць на слаўны мамэнт. І вось гэты мамэнт надыходзіць: Архімандрыт а. Васіль стае на калені перад сьвятым Пасадам, Найсьвятарнейшыя Епіскапы кладуць на ягоную галаву сьв. Евангельле і ўскладаюць свае рукі ды чытаюць адпаведныя малітвы. Усе вернікі із затоеным дыханьнем і сэрцамі, зьверненымі з падзякай да Усемагутнага, чакаюць канца малітваў. І вось — наш кандыдат Архімандрыт Васіль устае перад сьвятым Пасадам ужо як Епіскап БАПЦ.

Малітвы падзякі й словы імкнуцца да Госпада Бога з душаў і сэрцаў сотняў вернікаў. Нарэшце Ен спадобіў нас атрымаць сваю собскую Царкоўную Гіерархію, бо пастановай Сьвят. Сабору Епіскапаў УАПЦ, Найсьвятарнейшы Епіскап Сергі поўнасьцяй адыходзіць да нас, да нашай БАПЦ.

Далей Епіскап Васіль служыць ужо сьв. Літургію разам зь іншымі Епіскапамі. Урачыстасьць сьв. Літургіі была яшчэ павышаная казанямі двох Епіскапаў УАПЦ — Вячэслава й Платона, гарачым словам грузінскага сьвятара а. Дэмітрашвілі й апрача таго малебнам сьв. Мікалаю, у імя якога высьвечаная нашая Царква. Вернікі й ня думалі пад канец урачыстасьці, што ўжо другая гадз. папаўдні. Іхныя сэрцы ўсе яшчэ жадалі быць у Царкве. Але, царкоўная ўрачыстасьць скончылася. Госьці й жыхары лягеру ідуць на супольны абед.

На гэтай людная і запраўды ўрачыстай бяседзе адзін па адным бралі голас для прывітаньня новахіратанізаванага Епіскапа, усяе БАПЦ і Беларусаў наагул прадстаўнікі розных нацыянальных і грамадзкіх арганізацыяў, што прыбылі гасьцьмі на гэтую нашую ўрачыстасьць. Сярод іх (агульным лікам 25) трэба адзначыхь Іх Найсьвятарстваў Епіскапаў УАПЦ Платона, Вячаслава й Сергія, праф. Студзінскага (ЦПУЭ), генэрала Хінко Алябанда (ад Харватаў), сп. Інжынера Глазкова (ад казакаў), рэктара праф. Б. Мартоса (ад праваслаўнае Грамады Украінцаў Мюнхэну), палк. Яніва (ад украінцаў — Гэтманцаў), сп-ню Коломінскую Ал. (ад украінскіх жанчынаў), сп. Колымніка (ад укр. моладзі), мгр. Р. Ільніцкага (ад укр. прэсы), сп. М. Гікавага (ад Укр. Камбатантаў, паліт. вязьняў і студэнтаў), студ. Вароніна (ад Укр. Багасл. Акадэміі), украінскіх сьвятароў а. а. Царыка, Шэмэтылу, Шчэрбана, праф. А. Мартыненку (парафія УАПЦ Мюнхэн), сп. Вавенку (ад украінцаў францускае зоны і інш. а таксама зь беларускага боку а. Хв. Данілюка (сьвятар БАПЦ з францускае зоны) а Ул. Салаўя (ад беларусаў-каталікоў), прадстаўнікоў ад ангельскае зоны, ад журналістых, ад вайскоўцаў і інш.

У пісьмовай форме прыбылі віншаваньні ад Яго Высоканайсьвятарствы Мітрапаліта УАПЦ Палікарпа, ад ІНКОПОРЭ, ад АБН, ад Чэскае Народнае Скупіцы ў Зах. Нямеччыне, ад укр. лягеру ў Дылінгене, ад Цэнтралі Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў на Чужыне, ад беларускіх Студэнтаў у Бэльгіі, ад Беларускага Задзіночаньня ў ЗША, ад Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне, ад Беларусаў у Аўстраліі, ад Беларусаў Даніі, ад вернікаў Парафіі БАПЦ у Гановэры й інш. Новыя й новыя прывітаньні з розных канцоў надыходзяць і цяпер, у часе друку гэтага нумару.

Вялікае гістарычнае значаньне давершаньня акту аднаўленьня Гіерархіі асірочанае БАПЦ чырвонай ніткаю адзначаецца ўва усіх гэтых прывітаньнях. Усе яны таксама падчыркваюць бліскучы выяў братняе ўзаемадапамогі двух суседніх народаў — Беларускага й Украінскага, што знайшоў сабе адлюстраваньне ў гэтым акце і зьвязаных зь ім урачыстасьцях.

І. НАВІЦКІ

Прывітаньне Прэзыдэнта

Дарагія Сестры, Браты, Грамадзяне ў няволі, вольныя эмігранты!

Вітаю Вас усіх з Радасным Сьвятам Нарадзінаў Хрыста-Збавіцеся і Сьвятам Новага Году.

Заклікаю Вас усіх у гэтыя дні злучыцца у супольнай малітве, каб Бог дадаў нам вытрываласьці ў нашых цярпеньнях, сілы ў змаганьні, веры ў перамогу.

Я моцна перакананы, што падзеі пэўным і шпаркім крокам набліжаюць нас да тае часіны калі мы усе з цэлага сьвету павярнуўшыся пад родныя стрэхі нашай прыгожай Бацькаўшчыны — Беластоку — Смаленску, Пскову — Вільні — Палесься... зазвонім там магутна ў званы нашых цэркваў, касьцелаў, як вольныя грамадзяне Вольнай і Незалежнай Беларусі!

А пакуль Бацькаўшчына наша ў няволі, памаліўшыя Богу, напружым ізноў усе свае сілы, усе свае здольнасьці да змаганьня з нашым лютым ворагам, за нашыя сьвятыя, агульна людзкія ідэалы, за праўду, справядлівасьць!

Праўда пераможа, праўда у нас!

Нью-Ерк. **М. Абрамчык**

Першая Сэсія

Сьвяшчэннага Сабору Япіскапаў Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы

Дня 20 сьнежня 1949 г. у беларускім лягеры ў Розэнгайме адбылося паседжаньне І-ай Сэсіі Сьвят. Сабору Япіскапаў БАПЦ.

На паседжаньні, на якім прыняў удзел, як госьць, Прэасьвяшчэньнейшы Япіскап **Платон** былі прыняты, між іншага наступныя пастановы:



Першая Сэсія Сьвяшчэннага Сабору Епіскапаў БАПЦ.

1. На падставе заслуханых Дакумантаў, **Сьвяшчэнны Сабор Япіскапаў Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы** прагалошвае **Адраджэньне** Іерархіі БАПЦ за **дакананае;**

2. Іерархія БАПЦ устанаўляецця ў складзе: Прэасьвяшчэньнейшага Епіскапа **Сергія** й Прэасьвяшчэньнейшага Епіскапа **Васілія** й складае з сябе — **Сьвяшчэнны Сабор Епіскапаў БАПЦ на чужыне;**

3. На падставе 34-га Апостальскага Правіла й просьбу беларускіх духоўных і грамадзкіх установаў, уважаюць Главою Сьвяшчэннага Сабору Епіскапаў БАПЦ Прэасьвяшчэньнейшага Епіскапа Сергія і надаць яму Сан Архіяпіскапа з правам нашэньня брыльянтавага крыжа на клобуку як Архіяпіскапскай адзнакі, бяручы на ўвагу ягоную папярўднюю высокацэнную працу на карысьць БАПЦ;

4. Сакратаром Сьвяшчэннага Сабору Епіскапаў БАПЦ паклікаць Прэасьвяшчэньнейшага Япіскапа **Васілія;**

5. З Нагоды надыходзячых сьвятаў **Ражства Хрыстовага** й **Новага Году,** а таксама ў зьвязку з адраджэньнем Герархіі БАПЦ — выдаць **Саборнае Архіпастырскае Пасланьне.**

У апошнюю хвіліну

— **Адмысловая Палітычная Камісія ЗН ухваліла праект уміжнародненьня Ерузалему** пад кіраўніцтвам адмысловае Камісіі ЗН. Ізраэль, ЗША і Вялікая Брытанія галасавалі супраць гэтага праекту.

— **Забаставалі работнікі «атомнага гораду»** Оўкбрыдж у ЗША. Прычыны бліжэй нязнаныя.

— **Францыя забараніла вывозіць ваенныя матар'ялы** ў краі за зялезнаю заслонаю за выняткам Югаславіі й Фінляндыі.

— На працягу апошняга месяцу **Саветы двойчы пакідалі саюзную кантрольную раду** для Японіі.

— **Лейбарыстыя праваліліся на выбарах у Аўстраліі.** Яны здабылі ўсяго 44 месцы ў парлямэньце, тымчасам як апазыцыйная ім кааліцыя лібэральнае й краевае партыі — 75 месцаў.

— **У Францыі скасаванае рацыянаваньне прадуктаў** (апошнім рацыянаваным прадуктам, што выдаваўся на карткі, была кава).

— **Індыя й Афганістан** падпісалі пяцьгадовы пакт міру й прыязьні.

Саборнае архіпастырскае пасланьне

БОЖАЙ МІЛАСЬЦЮ СЬВЯШЧЭННЫ САБОР ЯПІСКПАЎ БЕЛАРУСКАЕ АЎТАКЕФАЛЬНАЕ ПРАВОСЛАЎНАЕ ЦАРКВЫ НА ЧУЖЫНЕ.

Да Усейчэснога Духавенства, прэпадобнага Манашаства й усіх Богалюбівых Вернікаў БАПЦ на Чужыне.

Улюбленыя ў Хрысьце Дарагія Браты й Сестры!

«Хрыстос раджджаецца — Яго слаўце й радуйцеся!» Так сьпявае наша Сьвятая Царква, сьпяваюць усе хрысьціянскія народы, у тым ліку й наш Беларускі Народ ужо хутка 20 вякоў.

Ражство Хрыстовае сваім Божаскім сьвятлом асьвяціла паганскую цемру нашых продкаў, сталася ў іх цяжкім жыцьці яснай зоркай, якая вядзе нас да Найясьнейшага Сонца — Госпада Бога, нашага Збавіцеля, Крыніцы вечнага жыцьця, вечнага блажэнства.

Таму сяньня наша душа, якая заўседы імкнецца да свайго Творцы й жадае зьліцца зь Ім, нявымоўна хвалюецца й радасна сьпявае: «Слава на вышынях Богу й на зямлі мір сярод людзей добрай волі» (Лк. 2, 14). Бо ў гэтую Сьвятую Ноч навет уся прырода, як-бы зачараваная сьвятлом Зоркі Віфлеемскай, гатуецца да раданснага Адраджэньня, да спатканьня свайго Валадара.

Тым больш радуюцца людзі! Асабліва-ж радаваўся й радуецца, цешыўся й цешыцца ў гэтую Сьвятую Ноч наш пабожны Беларускі Народ! Сэрцамі простымі й ціхімі душамі й сэрцамі ен як-бы становіцца на калені разам з пастушкамі перад Сьвятым Ангелам, Які абвясьціў ім паводле Сьв. Евангельля: «І сказаў ім Ангел: ня бойцеся! бо я вам абвяшчаю вялікую радасьць, што будзе ўсім людзям: бо цяпер нарадзіўся ў Віфлееме Збавіцель, Каторы есьць Хрыстос Гасподзь» (Лк. 2, 10—11).

Хрыстос — Бог Любві. Таму ў гэты Сьвяты Вечар вялікая Любоў палае з душаў і сэрцаў Беларускіх ціхіх сем'яў, якія сьпяшаюцца часта з далекіх краеў да свайго Бацькаўскага стала з сенам на ім, як да ясьляў, бо хочуць быць разам із сваімі любімі й разам зь Ім — Народжаным Хрыстом.

Гэтую сьветлую традыцыю падтрымоўвала й падтрымоўвае ад вякоў наша Сьвятая Праваслаўная Царква. Гэтая вялікая наша радасьць была, нажаль, заценменая ад 1946 г. адыходам ад нас нашых Царкоўных Іерархаў, якія пакінулі сваю ўласную паству бяз Пастыраў. Тым большая няхай будзе наша радасьць цяпер, у гэтым годзе. Гасподзь наш Ісус Хрыстос выслухаў малітвы нашых Сьвятых, ласкавым вокам глянуў на нас і дараваў нашай асірацелай Царкве, а гэтым і нам, двох Іерархаў: Архіяпіскапа Сергія ад Украінскае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы й Япіскапа Васілія, прадстаўленага самымі Вамі й хіратанізаванага на Япіскапа Віленскага 19-га сьнежня 1949 г.

Таму наша БАПЦ сяньня асабліва цешыцца й радуецца: славіць Ражство Хрыстовае й адначасна Адраджэньне сваей Кананічнай Іерархіі, на падставе 89-га Правіла Карфагенскага Сабору. На падставе I-га Апостальскага Правіла, I-га Правіла другога Усяленскага Сабору мы ўжо маем свой Сьвяшчэнны Сабор Япіскапаў БАПЦ.

Дык, Дарагія Браты й Сестры, цешцеся, радуйцеся й слаўце наша вялікае Сьвята — Ражство Хрыстова! Із сьлязамі дзякуйце Яму — Народжанаму Хрысту — за тую вялікую Благадаць, якую Ен прыгатаваў для нас у нашым цяжкім цяперашнім жыцьці. Няхай гэтае пачуцьце радасьці зьвяжае нас усіх на ўсім сьвеце й нашай роднай шматпакутнай Зямельцы Беларусі разам з нашым Госпадам Ісусам Хрыстом у вадну гармаыйную Богалюбівую сямейку. Няхай зможуць сярод нас — «Варожасьць, сваркі, завісьць, гнеў, нязгода, непаразуменьні» (Гал. 5, 20). Няхай кажны шчыры Сын Беларускага Народу, ці то Духоўнік (Япіскап, сьвяшчэньнік, дыякан), ці то міранін сьпяшаецца злучыцца з нашаю найнадзейнейшаю апораю — сьвятою БАПЦ, якая, атрымаўшы Родную Іерархію, вымаліць у Усемагутнага Бога — Госпада нашага Ісуса Хрыста далейшую Ягоную Міласьцьв да нас — паварот на нашую мілую, дарагую Бацькаўшчыну — Беларусь, да нашых родных Храмаў, да нашых Братоў і Сестраў.

Зь непарушнаю вераю ў Міласэрдзе Божае, з шчыраю любоўю да Яго, разумеючы добра сваю адказнасьць перад Ім і нашай шматпакутнай Беларусяй, Вітаем Вас, улюбленыя Браты й Сестры, зь вялікім Сьвятам Ражства Хрыстовага й надыходзячым Новым Годам. Будзем маліцца да Яго, Нованароджанага Хрыста, Бога нашага, каб ужо ў наступным годзе Ен спадобіў нас праслаўляць Ягонае Нараджэньне пад сваімі роднымі стрэхамі, у сваей Вольнай старонцы.

Пасылаем Вам усім нашае Архіпастырскае Багаслаўленьне. Узмацняйце Веру ў сэрцах Вашых. «Будзеце мудрыя на Дабро й нявінныя на Зло. Бог-жа міру неўзабаве скрышыць Сатану пад нагамі Вашымі. Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з усімі Вамі.» (Рымл. 16, 19—20).

СЬМІРЭННЫ АРХІЯПІСКАП СЕРГІЙ
Глава Сьвяшчэннага Сабору Япіскапаў Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы.

СЬМІРЭННЫ ВАСІЛІ,
Япіскап Віленскі Сакратар Сьвяшч. Сабору Япіскапаў БАПЦ на Чужыне.

Дана Року Божага 1949,
месяца сьнежня, у Розэнгайме, Нямеччына.

4-я СЭСІЯ БНР

У днях 9 і 10 кастрычніка 1949 г. у вадным з местаў Заходняе Нямеччыны адбылася 4-ая Сэсія Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, на якой быў разгледжаны шэраг важнейшых пытаньняў беларускае нутраное і вонкавае палітыкі.

Радныя заслухалі даклад Прэзыдэнта БНР аб міжнародным наладжаньні і прынялі рад важных пастановаў у царкоўных і грамадзкіх справах беларускае эміграцыі. Быў ухвалены дадатак да статуту Рады БНР, згодна якога «кандыдатаў у сябры Рады БНР могуць выбіраць і прадстаўляць на зацьверджаньне прэзыдэнта БНР цэнтральныя грамадзкія арганізацыі краеў эміграцыі».

Рада пастанавіла стварыць **спэцыяльны фонд БНР** «Фонд 25-га Сакавіка» для фінансаваньня працы Ураду і Рады БНР. Дзеля гэтае мэты пастаноўлена ўвесьці ўсеагульны штомесячны грамадзкі падатак у вышні, якую сабе дабраахвотна вызначыць кажны беларус-эмігрант. Збор гэтага падатку даручаны Сусьветнаму Аб'еднаньню Беларускай Эміграцыі (САБЭ).

Пасьля справаздачы Ураду БНР і зладжэньня ім свае дымісіі Прэзыдэнт БНР даручыў сфармаваць новы Урад дасюлешняму прэм'еру, што і было зроблена на 2-гі дзень. Новы Урад у тайным галасаваньні атрымаў вотум даверу з боку Рады БНР.

Сакратарыят

Выцяг з пратаколу № 2

паседжаньня VI сэсіі Сьвят. Сабору Епіскапаў УАП Царквы на эміграцыі, адбытага 4. лістапада 1949 г. у украінскім лягеры

ў Дылінгене.

Былі: Высоканайсьвятарнейшы Мітрапаліт **Палікарп**, Старшыня Сьвят. Сабору Епіскапаў УАП Царквы, Заступнік Мітрапаліта Высоканайсьвятарнейшы Архіепіскап **Нікaнор**, Высоканайсьвятарныя Архіепіскапы **Ігор**, Геннады і Найсьвятарныя Епіскапы **Валадзімер, Вячаслаў** і **Сергі** ды Епіскап **Платон**, Сакратар Сабору Епіскапаў.

Слухалі: Прапанову Сьвят. Сыноду УАП Царквы ды Сьвят. Сабору Епіскапаў на аснове просьбаў ад арганізаванага праваслаўнага Беларускага грамадзтва пра высьвячэньне для Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы епіскапа з паданьнем кандыдата на гэтае высокае становішча духоўнае — гіераманаха Васіля (Тамашчыка).

Заслуханы даклад у гэтай справе Епіскапа Платона, Сакратара Сьвят. Сыноду, з прачытаньнем адпаведных дакумэнтаў, зь якіх відаць, што епіскапы БАП Царквы на эміграцыі пакінулі яе і ўсе адыйшлі пад юрысдыкцыю Расейскае Зарубежнае Царквы.

Пасьля грунтоўнага абмеркаваньня вышэйназванага пытаньня пра нядолю БАП Царквы на эміграцыі.

Пастанавілі: 1) Заслухаўшы даклад у падзеднай Сьвят. Сынодам справе — высьвячэньня для БАП Царквы епіскапа й азнаеміўшыся даклaднa з прыкладзенымі да справы матар'ялямі, Сьвят. Сабор Епіскапаў падцьвярджае прынцыповую прапанову Сьвят. Сыноду УАП Царквы дапамагчы Братом-Беларусам у вадраджэньні іхнае роднае Гіерархіі, папярэджваючы магчымыя ўхілы кананічныя й навет ад праваслаўя, бо іхная гіерархія высьвячаньня 1941—43 г. г. пакінула БАП Царкву й адыйшла да чужое Расейскае Зарубежнае Царквы, асірачыўшы БАП Царкву.

2) Пададзенага кандыдата да хіратоніі на Епіскапа БАП Царквы гіераманаха Васіля (Тамашчыка) на працягу пэўнага часу выпрабаваць і пазнаеміцца бліжэй зь ягонымі пaглядамі на архіпастырскае служэньне.

3) Правядзеньне вышэйнадзначанага духоўнага выпрабаваньня пададзенага кандыдата даручыць Архіепіскапу **Геннадыю** і Епіскапу **Вячаславу**. Хіратонію мелі-б правесьці: Архіепіскап **Ігор** і Епіскапы **Вячэслаў** і **Сергі**.

4) Калі гэтае духоўнае выпрабаваньне гіераманаха Васіля (Тамашчыка) пакажа пазытыўныя вынікі, дык пасьля паведамленьня пра гэта Высоканайсьвятарнейшага **Мітрапаліта Палікарпа** й атрыманьня ад Уладыкі **Мітрапаліта** благаслаўленьня, правесьці на просьбу Праваслаўных Братоў — Беларусаў хіратонію гіераманаха Васіля (Тамашчыка) на Епіскапа асірочанае БАП Царквы (Карфаген. 89) на карысьць Яе й на Славу Божую.

Слухалі: Заяву Найсьвятарнага Епіскапа Сергія ў Канстанцы ад 4. XI. 1949 г. пра выданьне яму адпускное граматы для пераходу да БАП Царквы для архіпастырскае апекі над праваслаўнымі братамі беларусамі на іхную просьбу.

Пастанавілі: а) Даручыць Уладыку Мітрапаліту **Палікарпу** выдаць Епіскапу **Сергію** адпаведную грамату на ягоную просьбу, зьвязаную з просьбаю праваслаўных Беларусаў.

б) Найсьвятарны **Сергі**, не зважаючы на свой пераход у БАПЦ, будзе й надалей апекавацца на францускай зоне й праваслаўнымі ўкраінцамі.»

Арыгінал за належнымі падпісамі.

З арыгіналам згодна,

Епіскап Платон,

Сакратар Сьвят. Сыноду УАП Царквы.

Мэмарыял паняволеных народаў Эўропы

БІБ. Дзеля таго, што 17 і 18 кастрычніка радыестанцыі Лендану й Нью-Ерку паведамілі аб тым, што Генэральны Сакратар Арганізацыі Задзіночаных Нацыяў Трыгвэ Лі прыняў мэмерыял або палажэньні народаў у краях Паўночна-Усходняе, Цэнтральна — й Паўдзенна-Усходняе Эўропы, што знаходзяцца пад тыраніяй маскоўскага камуністычнага імпэрыялізму, чытачы «Бацькаўшчыны» зьвярнуліся з просьбаю падаць да публічнага ведама тэкст гэтага мэмарыялу. Ідучы на спатканьне гэтай просьбе, БІБ зьвярнулася да Ураду БНР і атрымала копію мэмарыялу, які тут і публікуецца.

Яго Эксцэленцыі Спадару Трыгвэ Лі, Гэнэральнаму Сакратару Задзіночаных Нацыяў.

Ваша Эксцэленцыя!

У чацьвертай гадавой справаздачы Генэральнай Асамблеі Задзіночаных Нацыяў Вы аддалі адмысловую ўвагу Дэклярацыі Людзкіх Правоў і падчыркнулі важнасьць абароны гэтых правоў для будучага разьвіцьця міжнародных дачыненьняў у наступных словах:

«У змаганьні за пашырэньне захоўваньня людзкіх правоў у сьвеце мінулы год бачыў адзін з найбольш патэнцыяльна вызначных развояў гісторыі ў вабвесчаньні Генэральнай Асамблеяй Дэклярацыі ЛюдзкіХ Правоў.»

2) Гэтая Дэклярацыя, прынятая Асамблеяй 10-га сьнежня 1948 г. абвяшчае, між іншага, што

«усе людзкія істоты народжаныя вольнымі й роўнымі ў годнасьці й правох» (Арт. 1)

«кожны ўпраўнены да ўсіх правоў і свабодаў, выкладзеных у гэтай Дэклярацыі, бяз вырозьненьня якога-небудзь роду, такога як раса, колер, род, мова, рэлігія, палітычныя ці іншыя пагляды, нацыянальнае ці сацыяльнае паходжаньне, нараджэньне ці стан» (Арт. 2)

«кожны ўпраўнены да сацыяльнага й міжнароднага парадку, у якім правы й свабоды, выкладзеныя ў гэтай Дэклярацыі, могуць быць поўнасьцю рэалізаваныя» (Арт. 28)

3) Гэтыя людзкія правы, устаноўленыя ў Дэклярацыі, ігнаруюцца й парушаюцца ў краех Паўночна-Усходняе, Цэнтральна- й Паўдзенна-Усходняе Эўропы цяпер пад савецкім панаваньнем. Упасобку ніжэйпадпісаныя ўстане давесьці, што ў іхных краех камуністычныя кіраўнікі сыстэматычна робяць наступныя злачынствы й крыўды:

а) самовольны арышт і затрыманьне;
б) выгнаньне й высылкі;
в) жорсткае, нялюдзкае ці зьневажальнае абыходжаньне або пакараньне;
г) нявольніцкая праца;
д) пазбаўленьне або абмежаньне свабоды руху;
е) пазбаўленьне свабоды думкі й пагляду;
ж) самавольнае ўмяшаньне ў прыватнае, сямейнае, хатняе жыцьцё й ліставаньне;
з) пазбаўленьне свабоды сходаў або накіданьне абавязку належыць да арганізацыяў (упасобку для моладзі й дзяцей);
і) самавольнае абмежаньне свабоды веры й сумленьня;
к) самавольнае пазбаўленьне нацыянальнасьці;
л) пазбаўленьне права вольнага абіраньня свайго ураду.

4) Адна з мэтаў Задзіночаных Нацыяў, паводля арт. 1 Хартыі, — «дасягнуць міжнароднага супрацоўніцтва ў разьвязаньні міжнародных праблемаў эканамічнага, сацыяльнага, культурнага або гуманітарнага характару й у ўздыманьні ды падахвочаньні да павагі да людзкіх правоў і асноўных свабодаў для ўсіх бяз вырозьненьня што да расы, роду, мовы або рэлігіі».

І ў арт. 56 «усе сябры Задзіночаных Нацыяў забавязваюцца ўшчынаць злучаныя й паадзіночныя дзеяньні ў супрацоўніцтве з Арганізацыяй дзеля дасягненьня мэтаў, выкладзеных у арт. 55.»

5) Паклікаючыся на мэты й прынцыпы Задзіночаных Нацыяў і на забавязаньні, прынятыя іхнымі сябрамі, ніжэйпадпісаныя маюць гонар прасіць Генэральную Асамблю Задзіночаных Нацыяў дасьледваць сытуацыю, што пануе ў іхных адпаведных краех, заініцыяваць акцыю, прадбачаную ў арт. 56 Хартыі, і ўжыць усе магчымыя мерапрыемствы дзеля адналўленьня свабоды й незалежнасьці — адзінае эфэктыўнае гарантыі людзкіх правоў — у краех, што гэтага пазбаўленыя ёсьць.

Ніжэйпадпісаныя гатовыя забясьпечыць Генэральную Асамблею або іншыя кампэтэнтныя органы Задзіночаных Нацыяў, ці ўсе кадекты ўна, ці кажны ўпасобку за свой собскі край, канечнымі дакумэнтамі ў падмацаваньні вышэйсфармуляваных абвінавачаньняў.

Прымеце, Эксцэленцыя, выраз нашае шчырае да Вас пашаны.

За Беларусь:
Мікола Абрамчык, Прэзыдэнт Рады Беларускае Народнае Рэспублікі,
Лявон Рыдлеўскі, за Міністра Замежных Справаў Ураду Беларускае Народнае Рэспублікі на выгнаньні.

За Баўгарыю:
Д. Матзанкіеў, ад імя Баўгарскага Нацыянальнага Камітэту «Вольная й Незалежная Баўгарыя».

За Чэхію:
Генэрал **Л. Прхаля**, Кавалер Ордэну Заслугі, ад імя Чэскага Нацыянальнага Камітэту.

За Эстонію:
Эстонская Нацыянальная Рада
Аўгуст Рэй, Прэзыдэнт,
Гэльмут Мааnды, Генэральны Сакратар.

За Вугоршчыну:
Вугорская Нацыянальная Рада
Джордж Б. Бэсэн'ей, Старшыня Камітэту Замежных Справаў Вугорскае Нацыянальнае Рады.

За Лацьвію:
І. Цэльмс, Прэзыдэнт Лацьвійскае Нацыянальнае Рады.

За Летуву:
М. Крунавічьюс, Старшыня Вярхоўнага Камітэту Вызваленьня Летувы й Выканаўчае Рады.

За Польшчу:
М. Сакалоўскі, Міністар Замежных Справаў,
І. Лукасевіч, Заступнік Старшыні Нацыянальнае Рады Польскае Рэспублікі.

За Славаччыну:
Кароль Сідор, Прэзыдэнт,
Пэтэр Прыдавок, Генэральны Сакратар Славацкае Нацыянальнае Рады замежжамі.

За Украіну:
Ісаак Мазэпа, Старшыня,
Сьцяпан Вытвіцкі, Заступнік Старшыні.

За Югаславію:
Слабадан Іпановіч, Прэзыдэнт Югаслаўскага Нацыянальнага Камітэту, былы Прэзыдэнт Усепартыйнага Югаслаўскага Ураду.

Увага БІБ: Генэральны Сакратар Задзіночаных Нацыяў 17. 10. 1949 г. паведаміў Сп. Прэзыдэнта М. Абрамчыка аб атрыманьні Мэмарыялу, які **«належна ўзяты на ўвагу ў вадпаведнасьці з працэдураю, устаноўленаю Задзіночанымі Нацыямі».** Пры гэтым да свайго ліста ен далучыў копію апэрацыйнае часткі рэзалюцыі 75 (V) Эканамічнае й Сацыяльнае Рады, папраўленае рэзалюцыяй 116 А (VI). Апрача таго, ад цэлага шэрагу дэлегацыяў на сэсіі ЗН, якія таксама атрымалі гэты мэмарыял, Сп. Прэзыдэнтам былі атрыманыя лісты, у якіх яны выказалі свае спачуваньні й сымпаты да паняволеных бальшавікамі народаў.

3-ці Агульны Зьезд

беларускага студэнцтва ў Бэльгіі

У часе ад 16 да 22 верасьня 1949 г. адбыўся ў Лювэне, Бэльгія, 3-ці Агульны Зьезд Цэнтралі Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў на Чужыне, у якім прыймала удзел беларуская студэнцкая моладзь Англіі, Францыі і Нямаччыны. Гэта быў першы зьезд беларускага студэнцтва паза Нямеччынай, на якім былі рэпрэзэнтанты з розных краінаў.

Прэзыдэнт Беларускае Народнае Рэспублікі, інж. М. Абрамчык, сваею прысутнасьцю на адчыненьні і жывым зацікаўленьнем нарадамі ня толькі дадаваў зьезду навагі але і паказаў, што нашае грамадзтва належна дацэньвае значэньне студэнцтва як такога, асабліва на чужыне, дзе ня шмат есьць беларускае інтэлігенцыі. Таксама вялікае зацікаўленьне Зьездам выявіла беларуская прэса й уплывовыя студэнцкія кругі, якія пачынаюць жыва цікавіцца беларускімі пытаньнямі ня скрываючы свае спагады цяжкай надолі нашага народу.

Пасьля прачытаньня прывітальных лістоў і тэлеграмаў ад розных беларускіх і чужынецкіх арганізацыяў і асобаў, **старшыня уступаючага ураду ЦБСА у свайей прамове падчыркнуў заданьні, якія сяньня стаяць перад беларускім студэнтам на чужыне** і якія абавязкі чакаюць яго на Бацькаўшчыне. Навязваючы да да гэтых заданьняў і абавязкаў, ен заклікаў студэнтаў уключыцца у грамадзкую працу, ня гледзячы на усе тыя цяжкасьці, якія трэба перамагчы пры здабываньні фаховае асьветы ў чужынецкім краі, — гэта зблізіць студэнцтва з грамадзтвам і ўвалье яго высілкі ў змаганьне беларускага народу як цэласьці за праўду і свабоду.

Пасьля прывітальных слоў сп. Прэзыдэнта, **а. Робэрт (бэльгіец), вялікі прыяцель беларусаў ў Бэльгіі,** у вельмі гарачай і прыязнай прамове зазначыў, што «студэнцтва павінна памятаць, што яно есьць ідэйнай часткай грамадзтва і таму нарады навінны ісьці ў гэтым кірунку. Беларускія студэнты павінны не забывацца, што зь іх будзе бальшая карысьць для Беларусі і Захаду, калі яны не расплывуцца ў чужынецкім моры, а наадварот, калі захаваюць свае чыста беларускія вартасьці й асаблівасьці». Чуць такія патрыятычныя словы з вуснаў чужынца — дасюль нам не здаралася.

На Зьезьдзе было дакладна разледжана жыцьце і праца беларускага студэнцтва ў розных краінах Заходняе Эўропы. Ня гледзячы на вялікія цяжкасьці, ЦБСА за свой перыяд дзейнасьці ад 3. II. 1947 да 3. X. 1949 выказалася вялікімі дасягненьнямі як у студэнцкім, так і грамадзкім жыцьці. Асабліва трэба адзначыць удачу здабыцьця грунту для беларускіх студэнтаў на лювэнскім унівэрсытэце, дзе у сучасны момант студыюе ўжо 14 студэнтаў і асаблівыя заслугі ў гэтым напрамку сп. Прэзыдэнта БНР. Студэнцкія згуртаваньні Нямеччыны ў Марбургу, Мюнхэне і другіх студэнцкіх асяродках дзякуючы цяжкім матарыяльным умовам і эміграваньню студэнтаў у іншыя краіны, трацяць што раз больш на значэньні. Лік студыюючых памяншаецца з кожным днем. Гэта выразна сьветчыць аб тым, што жыцьце беларускага студэнцтва ў Нямеччыне хутка замрэ. Затое пачынаюць мацнець студэнцкія асяродкі Англіі, Бэльгіі, Францыі. І так з радасьцю трэба адзначыць, што паўсталы новы студэнцкі асяродак у Лювэне, мае даволі выразныя пэрспэктывы на будучыню, бо ўжо есьць магчымасьць атрыманьня далейшых 30 стыпэндыяў. Трэба адзначыць, што мясцовыя ўнівэрсытэцкія ўлады у Любэне надзвычай прыхільна ставяцца да беларускіх студэнтаў, і таму можна спадзявацца, што гэты асяродак адыграе вялікую ролю ў гісторыі беларускага студэнцтва.

Падчас дыскусіі над пытаньнем адносінаў студэнта да беларускага вызвольнага руху, **Зьезд сьцьвердзіў, што мэтай яго есьць ня толькі вучоба але і актыўнае змаганьне у радох сьведамага беларускага грамадзтва пад сьцягам Беларускае Народнае Рэспублікі,** за рольную і незалежную Бацькаўшчыну.

Нарады прайходзілі вельмі ажыўлена і хаця яны трывалі 5 дзен, ніхто не адчуваў, што ен змучаны ці менш зацікаўлены ў абгавораных справах. Усе пытаньні былі правалкаваныя да дэталяў.

З мэтай пашырэньня арганізацыйных рамаў ЦБСА аказалася патрэба ў зьмене некаторых пунктаў статуту. **Зьезд прыняў новы назоў арганізацыі, а менавіта: Цэнтраля Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў (у скарочаньні: ЦБАА),** што дае магчымасьць належаньня да яе як тым, хто ўжо закончыў свае студыі, так і тым, хто іх яшчэ не пачаў, а мае на гэта права.

На старшыню ЦБАА быў выбраны дасюлешні старшыня ЦБСА сп. Б. Рагуля, а ў склад ураду ўвайшлі амаль выключна сябры з Лювэнскага Студэнцкага Згуртаваньня, каб такім чынам зрабіць урад як найбольш працаздольным. На кожную краіну, дзе маюцца беларускія студэнты, урад ЦБАА мае права вызначыць свае прадстаўнікоў сувязі. **Старшыней Стыпэндыяльнага Фонду** — вельмі паважнай арганізацыі пры ЦБАА — **быў выбраны а. др. Сіповіч** з Англіі, дзе на сеньняшні дзень есьць найбольшая можа магчымасьць сабраць грашовыя сродкі для памогі студэнтам.

Па закончэньні афіцыйнай часткі, **прыняў дэлегатаў на аўдыенцыю рэктар унівэрсытэту ў Лювэне.** На прыняцьці арганізаваным сябрамі Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне, дэлегаты мелі нагоду пазнаеміцца з прафэсарамі унівэрсытэту і студэнцкімі прадстаўнікамі розных нацыянальнасьцяў, ды абмяняцца зь імі думкамі і сваімі ўражаньнямі. Студэнты каталікі былі прыняты на адмысловай аўдыенцыі Я. Э. **бІскупам Сьлескансам.**

На закончэньне БСЗ у Лювэне зладзіла для дэлегатаў вельмі цікавую экскурсію, падчас якой былі зьведаны: Бібліятэка Унівэрсытэту Лювэн, Музэй Бэльгійскага Конго і сталіца Бэльгіі — Бруксэля, з якой асабліва асталіся ў памяці старажытная будоўля ратушы, касьцела, драгацэнныя экспанаты Музэю Старога Мастацтва ды ўладжаньні бэльгійскага парляманту і сэнату.

На разьвітаньне з Бруксэляй дэлегаты й госьці наведалі Каралеўскую Опэру, дзе ў той час ставіліся «Апавяданьні Гофмана».

РЭЗАЛЮЦЫЯ

прынятая 3-ім Агульным Зьездам Цэнтралі Беларускіх Акадэміцкіх арганізацыяў на Чужыне.

Дэлегаты ад беларускіх акадэміцкіх арганізацыяў Ангельшчыны, Бэльгіі, Францыі і Нямеччыны, сабраўшыся ў Любэне (Бэльгія) на 3-ці Агульны Зьезд ЦБАА, пасьля усебаковае дыскусіі над пытаньнем палітычнага твару беларускага студэнцтва і становішча ЦБАА адносна актуальных праблемаў беларускага вызвольнага руху, згодна выявілі волю падпарадкаваць беларускае арганізаванае студэнцтва, у яго грамадзкай працы, дзяржаўным органам Беларускае Народнае Рэспублікі.

Зьезд уважае, што ў сяньняшняй стадыі напружанага змаганьня нашага народу за палітычнае вызваленьне і адбудову беларускае дзяржаўнасьці, беларускае студэнцтва ня можа астацца збоку, а павінна заняць у ім належнае яму па традыцыі месца авангарду і актыўна, ды з энтузіязмам падтрымаць дзяржаўныя органы БНР ува ўсіх іхніх пачынаньнях.

Інтэрв'ю М. Абрамчыка

Прэзыдэнта Беларускае Дэмакратычнае Рэспублікі.

У бэльгійскай цэнтральнай газэце «Ля лібр Бэльжік» ад 21. 10. г. г. зьмешчана інтэрв'ю Прэзыдэнта БНР інж. М. Абрамчыка. Падаем вытрымкі з гэтага інтэрв'ю.

«Як мы ўжо абвяшчалі, — піша газэта, цяпер беларускія студэнты маюць важны кангрэс у Лювэне.

М. Абрамчык, прэзыдэнт Беларускае Дэмакратычнае Рэспублікі, канцылярыя якога знаходзіцца у Парыжы, прыбыў з францускай сталіцы, каб прысутнічаць на зьездзе сваіх суродзічаў.

Мы папрасілі прэзыдэнта Абрамчыка падзяліцца з намі сваімі ўражаньнямі аб сытуацыі палітычнай і рэлігійнай у свайей краіне.

— Беларусь, гаворыць ен, лічыць 18 мільенаў душ. З пункту гледжаньня рэлігійнага, краіна дзеліцца паміж праваслаўных (70%) і каталікоў (25%), ня лічачы розных сэктаў. У заходніх краінах, падкрэсьліває прэзыдэнт, вельмі часта спрабуюць зьмешваць беларускі народ і расейскі, ігнаруючы гістарычную праўду.

ВЯЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ БЕЛАРУСКІ КАНГРЭС

Далей прэзыдэнт зрабіў нам наступнае заяўленьне:

Першы Нацыянальны Беларускі Кангрэс меў месца ў Менску 18 сьнежня 1917 г. У канцы другога тыдня працы, дэлегаты абвясьцілі амаль аднагалосна, утварэньне Беларускай Дзяржавы. Расейская бальшавіцкая партыя, ужо дайшоўшая да ўлады, аказалася дужа варожай да ідэі аўтаномнасьці. Сталін выслаў у падмацаваньне супрацы беларусаў панцырную дывізію і сібірскіх стралкоў, якія мелі на заданьне разагнаць кангрэсістаў. Не ўважаючы на гэтую «асаду» кангрэс прадаўжаў сваю працу. Ен надаў поўную ўладу Радзе (правізарычным парлямэнт) падобна як-бы Выканаўчаму Камітэту, аж да таго часу, калі будуць праведзеныя вольныя выбары ў Беларусі. 25 сакавіка 1918 г. Рада абвесьціла Незалежнасьць Беларускае Дзяржавы. Гэтая дата сталася нацыянальным сьвятам прыгнечанага беларускага народу.

БЕЛАРУСКІ АПОР

Апор супроць нямецкага акупанта каштаваў беларусам больш за два мільёны ахвяраў толькі паміж цывільнага жыхарства.

Пасьля разгрому тэўтонскай арміі, ваенны савецкі ўрад ўвеў рэжым тэрору. Большая часьціна беларускай моладзі, ведаючы наперад, што можа прынесьці Беларусі савецкае «освобождение» настаралася злучыцца з партызанамі, што засталіся пасьля адыходу Немцаў.

УРАД НА ВЫГНАНЬНІ

Усе высілкі Масквы на працягу 30 год ліквідаваць дэмакратычны урад засталіся дарэмнымі. М. Абрамчык атрымаў праз тэстамэнт упаўнаважаньні прэзыдэнта Захаркі. Парлямэнт на выгнаньні налічвае цяпер 158 асоб, расьсеяных на ўсім сьвеце. Паміж іх толькі 30 засталіся на Беларусі, два ў Аўстраліі, тры ў Амэрыцы лацінскай, два ў Злучаных Штатах, адзін ў Канадзе, рэшта сяброў Рады знаходзіцца ў Эўропе. Дзевяноста дэлегатаў маюць магчымасьць аб'яднацца. Мэта, да якой імкнуцца Беларусы, гэта палітычная незалежнасьць Беларусі ў яе этнаграфічных граніцах.

НАДЗЕЯ Й ВЕРА У БУБУЧЫНЮ

На канчатак, прэзыдэнт Абрамчык выказаў нам свае надзеі на вольную будучыню свайго народу.

— Воля беларускага народу адбудаваць сваю незалежнасьць, — зазначыў ен, несьмяротная, не ўважаючы на палітычны тэрор, эканамічны і культурны ўціск праводжаны расейцамі. Наадварот, у гэтых драконаўскіх умовах беларускі народ здолеў разьвіваць сваю нацыянальную культуру і цывілізацыю. Сяньня ен цьвердза стаў на шлях бязьлітаснага змаганьня за сваю Незалежнасьць.»

БНР У ДАКУМЭНТАХ

(Працяг Гл. № 16/60)

Пратакол сходу Прэзыдыюму Рады БНР ад 6. VI. 20 г.

Слухалі: Пытаньне аб тым, што некаторыя Члены Ураду (Рады Міністраў) Беларускай Народнай Рэспублікі, па варунках варожых акупацыяў на Беларусі, не маглі ўзяць удзелу ў даручанай ім Урадовай працы, што адбілася і адбіваецца на працы Рады Народных Міністраў.

Пастанавілі: Каб пазбавіцца шкодаў, якія выплываюць з гэтага ненармальнага становішча, — скарыстаць надзвычайныя паўнамоцтвы, перададзеныя Радай Беларускай Народнай Рэспублікі 13-га сьнежня 1919 г. Прэзыдыюму Рады і даручыць Старшыні Рады Народных Міністраў, гр. Вацлаву Ластоўскаму, зрабіць належныя й вымаганыя варункамі Дзяржаўнай працы рэарганізацыі габінэту Рады Народных Міністраў з уключэньнем у яе склад новых асоб і партфоляў.

Віцэ-Маршалак Прэзыдыюму Рады БНР

В. Захарка.

Віцэ-Маршалак Прэзыдыюму Рады БНР

Палута Бадунова.

Сакратар Прэзыдыюму Рады БНР

Яз. Мамонька.

(«Бюлетэнь № 1 Рады Беларускай Народнай Рэспублікі», бал. 16. «Замежная Беларусь», бал. 131.)

РЭЗАЛЮЦЫЯ

Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарады ў Празе.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада ў Празе, абмеркаваўшы пытаньне аб дзяржаўным будаўніцтве Беларусі, у поўнай сьвядомасьці надзвычайнай вагі гэтага пытаньня, зазначае:

а) Беларусь зьяўляецца краем працоўнага беларускага сялянства, рабочых і працоўнай інтэлігенцыі, дзеля чаго Беларусь павінна быць дзяржавай працоўнага народу;

б) Беларусь павінна быць дзяржавай непадзельнай і ні ад каго незалежнай. Нарада зазначае, што ніякія, гэтак званыя, арыентацыі могуць быць падставай дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі. Адзінай асновай дзяржавы, адзінай сілай, якая збудуе Беларусь і забясьпечыць ей нармальнае развіцьцё, зьяўляецца сам працоўны беларускі народ;

в) Пасьля зьдзейсьненьня беларускай Дзяржаўнасьці, пасьля таго, як на беларускай зямлі запануе ўласная, ні ад каго незалежная ўлада, Беларусь працягне руку згоды дзеля вольнага саюзу ўсім народам, з якімі жыве побач і якіх яна лічыць за роўных братоў сваіх. Першай мэтай гэткага саюзу павінна быць узаемная абарона народных вольнасьцяў, якія здабудуць народы свайей барацьбой.

Прыймаючы пад увагу сучасны стан Беларусі, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада зазначае:

а) што адзіным законадаўчым органам Беларусі зьяўляецца Рада БНР, маючая праемсьценнасьць улады ад Усебеларускага Кангрэсу 1917 г.;

б) што адзінай адказнай уладай Беларусі зьяўляецца Урад БНР, маючы мандат ад Рады БНР.

Прыймаючы пад увагу, што праца Ураду БНР зьяўляецца адпавядаючай тым мэтам, якія прыняты Нарадай і што ў першую чаргу яна кіруецца да абароны непадзельнасьці і незалежнасьці Беларусі, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада пастанаўляе аб'яднаць каля Ураду БНР сілы ўсіх беларускіх партыяў, арганізацыяў і груп дзеля дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі.

Прага-Чэская, 28-га верасьня 1921 г.

(«Замежная Беларусь», бал. 63—64.)

ПРАТАКОЛ

Аб'еднанага Сходу Членаў Прэзыдыюму Рады і Ураду БНР ад 23 жніўня 1923 г. м. Коўна

Былі прысутныя: П. Крэчэўскі, А. Цвікевіч, В. Захарка, Л. Заяц, Я. Варонка і У. Пракулевіч.

Слухалі: Заяву Старшыні Ураду БНР. А. Цвікевіча аб створаным Урадзе у складзе: Старшыні Рады Міністраў і Міністра Загранічных Спраў А. Цвікевіча, Міністра Асьветы Я. Варонкі, вык. аб. Міністра Фінансаў В. Захаркі, Дзяржаўнага Кантралера Л. Зайца і Дзяржаўнага Пісара У. Пракулевіча.

Пастанавілі: Новы склад Ураду прыняць да ведама. Падцьвердзіць, што ўся праца Ураду вядзецца згодна пастановы Рады Рэспублікі ад 13 сьнежня 1919 г. Прэзыдыюмам Рады і Радай Народных Міністраў супольна, пад кіраўніцтвам Старшані Рады Рэспублікі П. Крэчэўскага.

Увага: Прэзыдыюмум Рады і Рада Народных Міністраў асобна не засядаюць.

Старшыня Рады Рэспублікі **П. Крэчэўскі.**

Старшыня Рады Міністраў **А. Цвікевіч.**

Сябры Рады Міністраў: **В. Захарка, Л. Заяц, Я. Варонка.**

Дзяржаўны пісар **У. Пракулевіч.**

(«Замежная Беларусь», бал. 126.)

МЭМАРАНДУМ У ЛІГУ НАЦЫЯЎ

АБШАР І НАСЯЛЕНЬНЕ

Беларуская Народная Рэспубліка па большасьці (ад 62% да 82%) беларускага жыхарства абыймае поўнасьцю 6 губэрняў былой Расеі: Віленскую, Горадзенскую, Віцебскую, Менскую, Магілеўскую, Смаленскую, і некаторыя прылягаючыя паветы сумежных губэрняў. Плошча абшару выносіць 415.453 кв. клм., з насяленьнем, па статыстыцы расейскай 1915 г. у 15,521.900 чалавек.

Сумежаць з Беларусяй на поўнач-усходзе — Вялікаросія, на поўдзень — Украіна, на захадзе і поўнач-захадзе — Польшча, Нямеччына, Літва і Латвія.

ЭКАНАМІЧНЫ СТАН

82% жыхарства займаецца сельскай гаспадаркай і жывелагадоўляй. Асноўны фонд багацьця Беларусі складае зямля і лес. Зямельны абшар раскладаецца так:

Аромай зямлі	15,912.000 кв. гэкт.
Лонак і сенажаці	5,668.000 „ „
Лесу	11,719.000 „ „
Балот і нягоднай зямлі	5,559.000 „ „
Рэчак і вазер	2,518.000 „ „
Усяго	41,376.000 „ „

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ПРАДУКЦЫЯ

На дадзеных 1914 г. урода пры трохпольнай сыстэме і самай нізкай сельска-гаспадарчай культуры выносіла у 6 губэрнях Беларусі 590 мільенаў пудоў, а тым ліку жыта — 150 мільен., аўса — 50, ячменю — 18, бульбы — 350, льнянога і канаплянага семяні — 7 мільенаў і інш.

Сабрана было валакна льну — 6,600.000 пудоў і пянькі 1,500.000 пуд.

Із сельска-гаспадарскіх прадуктаў, апрача хлеба экспартаваліся ў Польшчу, Вялікаросію і заграніцу па дадзеных таго-ж году:

Малочных прадуктаў	226.800 пуд.
Вітай і жывой птушыны	996.200 „
Кароўяга мяса	244.000 „
Сала і тлушчаў	149.000 „
Крахмалу	764.000 „
Алейнага семя	3,000.000 „
Кармовых траў	854.000 „
Жмыхаў	2,000.000 „
Невырабленых скураў	432.000 „
Чыстага сьпірытусу	12,000.000 „
Піва	3,000.000 ведзяр
Меду	50.000 „

(«Замежная Беларусь», бал. 132—133.)

(Працяг будзе.)

Зь Беларускага жыцьця

ПРЭЗЫДЭНТ БНР У ЛЕНДАНЕ

9-га лістапада г. г. сп. Прэзыдэнт БНР Інж. М. Абрамчык на шляху свайго падарожжа у Злучаныя Штаты Амэрыкі наведаў Беларусаў у Лендане. У суботу 12. II. 1949 у Беларускім Доме сп. Прэзыдэнт зрабіў для беларускага грамадзянства з Лендану і ваколіц даклад аб міжнароднай палітычнай сытуацыі і аб беларускім жыцьці на эміграцыі. Даклад быў праслуханы зь вялікім зацікаўленьнем, аб чым сьведчыла ажыўленая дыскусія.

На разьвітаньне сп. Прэзыдэнт пажадаў беларусам у Ангельшчыне посьпехаў у працы на грамадзкай ніве і абяцаў наведаць нас яшчэ раз на паваротным шляху за Злучаных Штатаў Амэрыкі і падзяліцца з намі ўражаньнямі яго пабыту у ЗША.

БЕЛАРУСКІЯ ЛІБЭРАЛЫ

Сябрамі «ВорддьЛібэраль Уніён» (Сусьветнай арганізацыі лібэралаў).

На зьезьдзе Сусьветнай Арганізацыі Лібэралаў у Візбадэне (Нямеччына) група беларускіх лібэралаў была прынята ў сябры гэтай сусьветнай арганізацыі.

Беларуская група лібэралаў была прынята таксама ў сябры «Лібэральс ін Эксіле (арганізацыя лібэралаў на выгнаньні у якую ўваходзяць групы лібэралаў з-за «зялезнай заслоны».

«БЕЛАРУСКІ ЭМІГРАНТ» — ДРУКАМ

Газэта беларусаў Канады «Беларускі Эмігрант», што да гэтага часу выдавалася на рататары, перайшла ўжо ад другога нумару на сталае выданьне друкам. Першыя нумары робяць ня дрэннае ўражаньне. Пажадаем нашым маладым энтузіястым посьпеху і пленнае працы на ніве беларускае прэсы.

5-ы ВЫПУСК МАТУРЫСТЫХ

Гімназіі імя Янкі Купалы

У лістападзе Беларуская Гімназія Імя Янкі Купалы у Розэнгайме рабіла 5-ты выпуск матурыстых. Не ўважаючы на прысьпешаныя тэмпы працы узровень ведаў новых матурыстых быў добры.

Паводле традыцыяў Беларускай Гімназіі імя Янкі Купалы і гэты 5-ты выпуск адбыўся у вельмі ўрачыстых абставінах.

УГОДКІ СЛУЦКАГА ПАУСТАНЬНЯ

Як нас паведамляюць з усіх куткоў эміграцыі, 29-ыя ўгодкі слаўнага ўздыму Случчыны селета, як і ранейшыя гады, прайшлі з надзвычайным уздымам. У гэтыя дні па ўсх беларускіх асяродках адбываліся ўрачыстыя багаслужбы і зборкі вэтэранаў. Асабліва урачыста гэтыя дні прайшлі ў Розэнгайме і Мітэнвальдзе, дзе, як ведама, роўна год таму нашыя браты з Мітэнвальду задакумэнтавалі сілу свае любові да роднага краю збудаваньнем сярод стромкіх небасяглых Альпаў памятніка змагарам за волю Беларусі, паўшым у часе слуцкага паўстаньня.

На зборцы беларусаў парыскае калені б. слуцкія паўстанцы падзяліліся з прысутнымі сваімі ўспамінамі з пройдзенага паўстанскага шляху.

БЕЛАРУСКАЕ СТУДЭНЦКАЕ ЗГУРТАВАНЬНЕ У ФРАНЦЫІ

Дня 2. X. 1949 г. паўстала у Парыжы Беларускае Студэнцкае Згуртаваньне, якое аб'ядноўвае ўсю студыюючую моладзь і кандыдатаў на студэнтаў. БСЗ ставіць мэтаю узаемную самапомач, пашырэньне матар'ялаў аб Беларусі і рэпрэзэнтацыю сярод студэнтаў іншых нацыянальнасьцяў.

З ЖЫЦЬЦЯ БЕЛАРУСАЎ У ДАНІІ

Наша рэдакцыя атрымала ліст ад беларусаў з Даніі, зь якого відаць, што жыцьце застаўшыхся там беларусаў вельмі цяжкое. Яны ўвесь час знаходзяцца пад пагрозай націску данскай паліцыі, каб выяжджалі з Даніі куды сабе хочуць і пад дамаганьнямі маскоўскіх камісараў, каб варочаліся «на родзіну». Нядаўна «масквічы» пад апекай данскай паліцыі некалькі разоў наведвалі той лягер, у якім жывуць беларусы, спадзяючыся вымагчы іх паварот у СССР. Заўседы аднак варочаліся з пустымі рукамі.

Гэтыя трывожныя настроі вытварыла вестка аб тым, што ў палове 1950 г. мае зьліквідавацца ІРО. Нашыя суродзічы ў Даніі вераць у тое, што ўжо мінулі тыя часы, калі савецкая місія гнала нашых людзей на «родзіну» як скаціну, што сілай ня могуць змусіць да рэпатрыяцыі. Аднак сытуацыя вельмі прыкрая, бо данскія ўлады не даюць спакою, дамагаючыся, каб пакінулі іх край. Таму данскія беларусы заклікаюць усіх беларусаў у Даніі гуртавацца ў адну дружную сям'ю.

Яны лічаць, што аб'яднаныя, супольным высілкам лягчэй змогуць абараніць свае інтарэсы і вырашыць свой лес ды і нашы цэнтральныя эміграцыйныя ўстановы хутчэй ім, аб'яднаным змогуць памагчы. Зусім правільная думка.

ІНТЭРВ'Ю ПРЭЗЫДЭНТА БНР ГАЗЭЦЕ «ЭСТОНСКІЯ ВЕСТКІ»

БІБ. Будучы ў Штокгольме, Прэзыдэнт БНР інж. М. Абрамчык даў штакгольмскай газэце «Эстонскія весткі» інтэрв'ю аб беларускім нацыянальна-вызвольным руху, якое газэта зьмясьціла ў сваім № 32/403 ад 16. 7. 1949 г. У гэтым інтэрв'ю сп. Прэзыдэнт- між іншага, заявіў: «Нашым непахісным ідэалам есьць аднаўленьне Беларускае Народнае Рэспублікі, якая 25-га сакавіка 1918 г. была абвешчана суверэнай дзяржавай. За гэты ідэал змагаецца наш вызвольны рух ,на чале якога стаіць Рада й Урад БНР на эміграцыі».

БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІЦКАЕ ТАВАРЫСТВА У ФРАНЦЫІ

Парыж. Пры «Хаўрусе Беларусаў у Францыі» паўстала Акадэміцкае Таварыства, у якое ўваходзяць сябры «Хаўрусу», што маюць акадэміцкі стаж ці падрыхтоўваюцца да яго, з мэтай пагліблення акадэміцкае веды, як і практычна-навуковае працы.

З ЖЫЦЬЦЯ ЗГУРТАВАНЬНЯ БЕЛАРУСАЎ У АРГЕНТЫНЕ

Мінула ўжо болей як паўтара году дзейнасьці Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне. Паўстала яно дзякуючы актыўнай групы беларусаў новай эміграцыі.

Згуртаваньне пашырае болей і болей сваю дзейнасьць у Аргентыне, і ўжо пераходзіць з пэрыяду арганізацыйнага на пазытыўную і практычную дзейнасьць. Дагэтуль ЗБА знаходзілася у памешканьні Украінскага Таварыства «Відроджэньне», якое аказала вялікую помач у згуртаваньні Беларусаў у Аргентыне. Цяпер ЗБА ужо ўрадуе ад 1 сьнежня у сваім асобным памешканьні. Гэта адна з найважнейшых падзеяў у нашым беларускім грамадзкім жыцьці, бо сапраўды гэта зьяўляецца праблемай, падшукаць свае собскае памешканьне. Сяньня кожны беларус зможа прыйсьці так як да сябе і чуцца сапраўды як у сябе. Там знойдзе свае часопісы, кнігі, розныя інфармацыі, спаткаецца са сваімі і пагутарыць аб сваіх і агульных справах. Гэта вялікі дзейнік прапаганды сярод старой эміграцыі.

Управа плянуе адкрыць беларускую, адзіную ў Аргентыне бібліятэку ад Новага Году з чытэльняй на мейсцы ў салене, а таксама пачне дзейнічаць мастацкая сэкцыя, якая перад гэтым ня мела месца на пробы.

Новая сядзіба ЗБА — гэта будзе сапраўдны беларускі свой родны кут, дзе кожны зможа пасьля працы дзенняй прыйсьці адпачыць і набрацца сіл да далейшага жыцьця і змаганьня за свой родны кут там далека на Бацькаўшчыне.

Аргентынскі

З ЗБВБ

Даклад аб патрэбе супрацоўніцтва паміж украінцамі і беларусамі ў міжнароднай палітыцы, адбыўся ў Беларускім Доме ў Лендане дня 5. X. г. г. Даклад зрабіў ведамы украінскі дзеяч сп. Панчук. Дакладчык прадставіў на колькі сытуацыя Украіны і Беларусі у палітычным сэнсе аналегічная і як неабходна супрацоўніцтва гэтых двух народаў дзеля выкарыстаньня іх плюсаў і вядзеньне барацьбы супроць супольных праціўнікаў.

Гэты зьместаўны даклад выклікаў вялізарнае зацікаўленьне сярод беларусаў, якое выявілася ў дыскусіі пасьля дакладу.

З ЦАРКОЎНАГА ЖЫЦЬЦЯ

Былы беларускі епіскап Філафей (Нарко), каліс «председательствующий расейскім арганізацыям на іхным зьезьдзе ў Нямеччыне, цяпер, як даведваемся, зложыў ад імя гэтых-жа расейскіх арганізацыяў вернападданскі мэмарыял вялікаму князю Уладзімеру Кірылавічу, як япіскап Расейскай Зарубежнай Царквы. Камэнтары не патрэбныя.

«Беларускае Слова» № 11/12

ПРАДАЛІ НАШУ ЦАРКВУ

Да нас дайшла вестка, што нашая Беларуская Праваслаўная Царква Сьв. Эўфрасіньні Полацкае, якую мы самі сваімі сродкамі й працай збудавалі ў 1946 г. у гор. Рэгенсбургу, днямі прададзена немцам былымі беларускімі япіскапамі — мітрапалітам Панцялейманам і архіяпіскапам Бэнэдыктам, якія ў тым-жа 1946 г. перайшлі ў Расейскую Зарубежную Царкву. Царква немцамі мае быць разбураная й перавезеная да сябе. Мы пратэстуем супраць гэтае гандлевае апэрацыі з нашай царквой ня еймымі ўласьнікамі і просім Духоўную Канцылярыю Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы перашкодзіць гэтаму.

Подпісы.

Шукаюць

Ручайлу Кастуся і яго жонку Феню, якія ў часе капітуляцыі ў 1945 г. прабывалі каля Мюнхэну, шукае Пількевіч. Весткі на адміністрацыю газэты.

Адказнасьць Амэрыкі

ЗА ШЧАСЦЕ Й МІР НА СЬВЕЦЕ

Навагоднае пасланьне Прэзыдэнта Трумана

Вашынгтон. — Прэзыдэнт ЗША, Гары Труман, зьвярнуўся да амэрыканскага кангрэсу із сваім штогодным пасланьнем «пра стан ЗША». Прэзыдэнтава пасланьне, як звычайна, складаецца з вонкава-палітычнае і нутрана-палітычнае часткі. Яно зьмяшчае фармулёўкі, якія вырашаюць кіраўнічыя лезунгі амэрыканскае палітыкі і ў якіх Прэзыдэнт падчырквае, што **сіла Амэрыкі абавязвае да адказнасьці за ўсе волялюбныя народы.** З гэтых лезунгаў найперш вынікае, што **ЗША і далей будуць весьці свае змаганьне за мір, раўнапраўнасьць людзей і супраць прыгнечаньня ды тыраніі.** У гэтай сувязі Прэзыдэнт Труман адзначыў, як найважнейшую падзею прамінулага пяцьдзесятгодзьдзя, зьінаўчаньне сусьветнапалітычнага палажэньня ЗША, якія не стаяць больш на ўскраўку, а ўжо ў васяродку сусьветных падзеяў.

Упаасобку, у галіне вонкавае палітыкі **Прэзыдэнт заклікаў кангрэс да падтрыманьня абаронных плянаў Атлянтычнага Пакту,** працягу пляну Маршала, тэхнічнага ўздыму неразьвітых краІнаў, найперш на Далекім Усходзе, узмацненьня капіталаўкладаў замежамі і адхіленьня абмежаньняў сусьветнага гандлю.

Нутрана-палітычная праграма Прэзыдэнта прадугледжвае прыняцьце ў ЗША Гаваяў і Аляскі, як раўнапраўных штатаў, правядзеньне праграмы аховы грамадзкіх правоў, а таксама некаторыя эканамічныя й сацыяльныя мерапрыемствы, як прыкладам пашырэньне дзяржаўнага забясьпечаньня беспрацоўных, абмежаньне надмернае манапалізацыі й выкарыстаньне атомнае энэргіі зделя мірных мэтаў. Прэзыдэнт падаў некаторыя вельмі важныя дадзеныя пра дасягненьні пры досьледах з атомнай энэргіяй.

КАНГРЭС АДЧЫНІЎСЯ

Вашынгтон. — Гэтымі днямі каля сотні сэнатараў і дэпутатаў кангрэсу ЗША зыйшліся на кароткае паседжаньне ў нованаладжаным залі паседжаньняў у Капітолі. Тымсамым афіцыйна пачалася другая сэсія 81-га кангрэсу. За колькі гадзінаў перад афіцыйным адчыненьнем сэсіі адбыліся традыцыйныя набажэнствы розных верависзнаньняў. Прэзыдэнт Труман узяў удзел у набажэнсьцьве прэсьбітэрыянскае царквы. На першым-жа сумесным паседжаньні абедзьвюх гаспода, адчыненым супольнай малітваю «Войча наш», правадыр рэспубліканскае меншасьці ў гаспадзе прадстаўнікоў, Джозэф Мартын, выступіў з войстрай крытыкай ураду Прэзыдэнта Трумана. Ен закінуў, што апошні хоча ўвесьці сацыялізм у ЗША.

ВАКОЛ ФАРМОЗЫ

Вашынгтон. — Апошнім мамэнтам адбываюцца ня зусім яшчэ ясныя палітычныя манэўры вакол апошніх апорных пунктаў кітайскага нацыянальнага ўраду — Фармозы й Гайнану. Шэф прэсы амэрыканскага міністэрства замежных справаў, Мак Дэрмот, заявіў на прэсавай канфэрІнцыі, што нацыянальны ўрад ЗША прасіў аб сьпешнай памозе Фармозе. Пэкінскае радые падало, што ўжо рыхтуецца патаемная ўмова абодвых урадаў. Аднак тымчасам амэрыканскае міністэрства замежных справаў зазначыла сваім замежным дыпламатычным прадстаўнікам, што Фармоза ня мае ніякае стратэгічнае вартасьці й магчыма неўзабаве падзе. Гэты абежнік міністэрства выклікаў войстрыя супярэчнасьці ў ЗША. Прэм'ер-міністар кітайскага нацыянальнага ураду Ен Сы-Чан хоча ўтрымаць Фармозу за ўсякую цану.

АСАБІСТАЕ

Беларуска, незамужняя, сярэдняга ўзросту, спакойная, жадае пазнаеміцца ў паважных намерах з беларусам у веку 25—29 год. Лісты на адміністрацыю газэты.

Двух сяброў, Янка і Алась, вэтэраны 2-ій сусьветнай вайны, 25 і 26 год, высокія і прыстойныя, жадаюць запазнаць землячак у тым-жа веку. Мэта — супольная эміграцыя. Толькі паважныя зглошаньні з фотоздымкамі і жыццяпісам слаць на адміністрацыю газэты.

Маркі БНР







Выйшла з друку першая сэрыя марак БНР вартасьцю ў 50 грашоў, 1 талер і 3 талеры. Неўзабаве выйдуць дадаткова ў 25 і 10 грашоў.

Кожны беларус — эмігрант павінен мець свае маркі. Маркі можна набыць у спэцыяльных упаважненых беларускіх грамадзкіх арганізацыяў кожнага краю эміграцыі. Усе сродкі ад марак ідуць у карысьць беларускае нацыянальнае працы.

Ніводнага беларуса бяз марак БНР!

У БНК

ПРЫЗНАНЬНЕ БНК

Галоўная Гаспода ІРО ў Бад Кіссінген, лістом з дня 21. 10. 1949 паведаміла аб прызнаньні Беларускага Нацыянальнага Камітету, як арганізацыю, рэпрэзэнтуючую перад ІРО беларускіх ДП і ўцекачоў у Амэрыканскай Зоне Нямеччыны. Аб прызнаньні пададзена да ведама ўсім Акругам і Падакругам ІРО.

ПРЫЗНАЧЭНЬНЕ АФІЦЭРАЎ СУВЯЗІ

У сувязі з прызнаньнем БНК ІРО устаноўлены наступныя асобы, як афіцэры сувязі.

Зонным афіцэрам сувязі зьяўляецца старшыня БНК мгр. М. Кунцэвіч.

Сувязным пры Арыі:

7 Мюнхэн — сп. М. Сьнежка,
6 Гаўтінг — сп. П. Манькоўскі,
5 Аўгсбург — сп. А. Шукелайць,
3 Ансбах — сп. С. Стаськевіч,
2 Штутгарт — сп. А. Галубовіч.

АШУРАНСЫ У ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ АМЭРЫКІ

У месяцы жніўні БНК, на прапанову Беларускага Камітэту ў ЗША, выслаў сьпіс беларусаў для выстаўленьня ашурансаў у Амэрыку. Дагэтуль выстаўлена 119 ашурансаў.

Дня 25. 10. 1949 высланы далейшы сьпіс на 50 сем'яў. Па гэтым сьпісе таксама паступова будуць выстаўляцца ашурансы.

РОЗНАЕ

— Апошнім часам у **Нямеччыну варочаецца з савецкага палону новы тып палонных** — спэцыяльна вышкаленых «актывістых-актыфашыстых». Усе яны — былыя эсэсаўцы. Яны апранены пацывільнаму й лепш за іншых і адкідаюць прывітаньне іх з боку сьвятара й чырвонага крыжа.

— Ранейшы амэрыканскі пасол у Маскве **Бэдэл Сьміт апублікаваў свае ўспаміны,** якія вельмі не спадабаліся бальшавікам. З трыбуны Задзіночаных Нацыяў Вышынскі назваў Сьміта «шпіенам» за гэтыя ўспаміны.

Наш Фонд

На выдавецкі фонд «Бацькаўшчыны» злажылі:

1. Беларусы Аўстраліі . . .	130	нм.	
2. Несьцярук Павал	5	„	
3. Канарчук Іван	5	„	
4. Яўневіч Мікола	5	„	
Беларусы Аўстраліі:			
5. С-й Мікола	17	„	50 ф.
6. Н-іч Стась	17	„	50 „
7. С-ль Алесь	17	„	50 „
8. Т-с Барыс	17	„	50 „
9. Я-ка Янка	4	„	30 „
10. К-к Алесь	5	„	70 „
11. Беларусы лягеру Розэнгайм	108	„	— „
12. Юрусь Аляксандар . . .	7	„	70 „
13. Сьвятар Шуст	35	„	— „

Усім ахвярадаўцам шчырае дзякуй.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне паведамляе аб тым, што зьмяніло свае месца ўрадаваньня, цяперашні адрес:

Asociacion Bielorusa el la Argentina, calle Coronel Sayos 2981. 4 de Junio — Buenos Aires.

У гэтым-жа памешканьні ад 1 студзеня 1950 гтду будзе чынная бібліятэка. Зьвяртаемся з просьбай да усіх Арганізацыяў і Рэдакцыяў высылаць па 1—2 эгз. усіх выданьняў для бібліятэкі.

Рэдагуе Рэдкалегія